# ПІЛЬНАСЦЬ, СВЯДОМАСЦЬ, ПРАФІЛАКТЫКА

## Як працуюць сельскія ўстановы аховы здароўя Брэсцкай вобласці ва ўмовах пандэміі, расказвае карэспандэнт «МС»

**Ачагі інфекцыі, як вядома, хутчэй узнікаюць у вялікіх гарадах, дзе шчыльнасць насельніцтва даволі высокая. У вёсках сітуацыя ў асноўным спакойная. Але ж пільнасць, павышаныя меры прафілактыкі ніхто не адмяняў, асабліва там, дзе жыве шмат сталых людзей, якія ў пэўнай ступені знаходзяцца ў групе рызыкі.**

### Пацыенты з групы рызыкі

**З фельчарам Далкоўскага ФА-Па Пружанскага раёна Лізаветай НІЧЫПАРУК** давялося сустракацца ў самым пачатку гэтага года. Тады **старшыня Ружанскага сельскага савета Аксана ЮРКОЎСКАЯ** рэкамендавала медыка як аднаго з самых старанных і адказных маладых спецыялістаў. Справа ў тым, што Лізавета працуе тут першы год. Выпускніца Пінскага медыцынскага каледжа адразу ўнікла ў асаблівасці работы, яе ўважлівае стаўленне да пацыентаў ацанілі жыхары навакольных вёсак.

У зону абслугоўвання маладога фельчара ўваходзяць чатыры вёскі: Далкі, Загалічы, Бярэзніца і Паўлава. З амаль 500 чалавек насельніцтва прыблізна 300 складаюць пенсіянеры. І калі раней яны стараліся самі прыйсці на прыём у сельскі ФАП, то цяпер часцей карыстаюцца магчымасцю пракансультавацца па тэлефоне альбо выклікаць медыцынскага работніка на дом.

— Работа мая ў сувязі з пандэміяй мала ў чым змянілася, — разважае Лізавета Нічыпарук. — Хіба толькі павышаныя меры бяспекі выконваем падчас прыёму. Цяпер пры наведванні пацыентаў — абавязкова ў масцы і пальчатках, памяшканне медустановы апрацоўваем некалькі разоў на дзень (ФАП размяшчаецца ў прасторным драўляным доме з печкай. — **Аўт.**). Вядома, цяпер часцей выязджаю на дом да людзей, асабліва пажылых. Там бяру аналізы, нярэдка дастаўляю лекі. У нас жа няма валанцёраў, як у вялікіх гарадах, так што ў пэўным сэнсе нам даводзіцца імі быць.

І ведаеце, усяляе аптымізм тое, што мае бабулькі і дзядулькі вельмі паслухмяныя, можна сказаць, свядомыя пацыенты. Ім рэкамендавалі лішні раз не наведваць паліклініку ці ФАП — яны і не ходзяць. Нават адно з адным сталі меней камунікаваць. Размаўляюць больш па тэлефоне. Хоць, здавалася б, для пажылых людзей вельмі важна ўбачыцца, абмеркаваць навіны. А яны, тым не менш, скарацілі свае стасункі і сумесныя пасядзелкі. Ведаюць, што гэта часова, таму адносяцца з разуменнем.

Пра часовасць гэтых мер Лізавета Нічыпарук гаварыла нядаўна са Стэфанідай Іванаўнай Зубеняй з Бярэзніцы. Жанчына 1931 года нараджэння жыве адна, сама сябе абслугоўвае, дома ў яе чысціня і парадак. Вядома, дзеці клапоцяцца, але ж і сама бабуля шмат чаго робіць. Адчула невялікае недамаганне — выклікала фельчара, за што тая яе пазней і пахваліла. Гэтым людзям часам не столькі таблеткі дапамагаюць, колькі словы спагады. Важна таксама, што большасць вясковых жыхароў прыслухоўваецца да парад медыка.

### Пра тых, хто на каранціне

У Папінскім сельсавеце Драгічынскага раёна працуюць два ФАПы




**Лізавета НІЧЫПАРУК, фельчар Далкоўскага ФАПа Пружанскага раёна.**

і ўрачэбная амбулаторыя. **Старшыня сельскага Савета Святлана ДЫШКО** ў размове адзначыла, што мясцовая ўлада ў цяперашніх умовах удзяляе шмат увагі інфармаванню насельніцтва.

— У нас на кожным інфармацыйным стэндзе, каля кожнага магазіна, ва ўстановах культуры змешчаны памяткі аб тым, як сябе паводзіць, каб зберагчы сваё здароўе, — кажа Святлана Дышко. — Усе мы — супрацоўнікі сельвыканкама, дэпутаты — праводзім гутаркі з людзьмі, нагадваем пра меры бяспекі. Пад асаблівым кантролем трымаем пытанне аб каранціне для асобных катэгорый грамадзян. Некаторыя жыхары вёсак працавалі ў Расіі, краінах Еўропы. Ёсць у нас будаўнікі, дальнабойшчыкі, якія ў сувязі з эпідэмічнай абстаноўкай тэрмінова вярнуліся дадому. Мы іх наведалі, азнаёмілі пад подпіс з дакументамі аб неабходнасці двухтыднёвай самаізаляцыі.

Варта сказаць, што большасць жыхароў вёсак сельсавета з разуменнем паставіліся да патрабаванняў: каранцінныя меры выконваюць, усе адчуваюць сябе добра, знаходзяцца пад наглядам медыкаў. Адзін чалавек, праўда, не вытрымаў знаходжання дома і аднойчы прыйшоў у сельскі магазін. Пра гэта адразу паступіў сігнал у сельсавет, яго прадстаўнікі наведалі грамадзяніна і вынеслі яму вымову за парушэнне.

— І гэта правільна: трэба папраўляць аднавяскоўцаў, калі яны не ўсведамляюць адказнасці за ўласныя паводзіны, — лічыць старшыня сельскага Савета.

### Пра карысць абходаў

**Фельчар Ляхавіцкага ФАПа, дэпутат Папінскага сельсавета Міхаіл ПАДОЛЬСКІ** кажа, што асноўны змест яго работы заключаецца ў прафілактычных наведваннях пацыентаў па месцы пражывання. Міхаіл Міхайлавіч паходзіць з дынастыі медыкаў, у Ляхавіцкім ФАПе больш за 40 гадоў адпрацавала яго маці, якая і навучыла ведаць пра стан здароўя кожнага пацыента, быць для вяскоўцаў сямейным медыкам.

— У нас цяпер мала выклікаў. Але, каб наведаць умоўную Марыю Іванаўну, мне выклік не трэба, — расказвае Міхаіл Падольскі. — Я ведаю асаблівасці яе гіпертаніі, з перыядычнасцю, якую вызначаю сам у залежнасці ад гісторыі хваробы, прыязджаю. Калі трэба, накіроўваю да ўрача-спецыяліста ці на шпіталізацыю. І людзі ўжо давяраюць майму меркаванню. Цяпер мала што па сутнасці памянялася ў паўсядзённай рабоце фельчара. Так, больш, чым раней, нагадваю пра меры прафілактыкі, назіраю за тымі, хто знаходзіцца ў каранціне пасля прыезду з краін блізкага і далёкага замежжа.

> «Цяпер часцей выязджаю на дом да людзей, асабліва пажылых. Там бяру аналізы, нярэдка дастаўляю лекі. У нас жа няма валанцёраў, як у вялікіх гарадах, так што ў пэўным сэнсе нам даводзіцца імі быць».

### Пра сезонны ўсплёск і паступовы спад

Павіццеўская амбулаторыя ўрача агульнай практыкі, што ў Кобрынскім раёне, працуе ў звычайным рэжыме. Яе ўнікальнасць хіба ў тым, што аддаленая вёска Павіцце адна ўтварае цэлы сельсавет і цэлы ўчастак для амбулаторыі. Прыблізна 1300 чалавек складаюць зону абслугоўвання **доктара Марыны ГЕЛЕМЕНТ.**

— Сёння на прыём зранку прыйшло няшмат людзей, — адзначае Марына Фёдараўна. — А вось у сакавіку ў нас быў усплёск прастудных захворванняў. Даўно такога не прыпомню, каб людзі ішлі літаральна адно за адным. На шчасце, гэтае сезоннае захворванне ў красавіку пайшло на спад. Цяпер хворых у калідорах паменела. Ды і шырокае інфармаванне насельніцтва адыграла ролю, людзі стараюцца заставацца дома, пры сімптомах хваробы выклікаюць урача. Таму па выкліках даводзіцца хадзіць крыху больш, а ў астатнім абстаноўка звычайная, — кажа доктар.

Дарэчы, у вёсцы працуе аптэка, дзе ёсць усе сродкі абароны і дэзінфекцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Брэсцкая вобласць.*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| Продавец | **ЗАО «МВЗ Интер»,** г. Минск, пр-т Партизанский, 8, к. 2/2, комн. 305 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8**

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 442171 | **Станок сверлильно-расточный с ЧПУ 24К40СФ4** | **5 640,00** | 282,00 |
| 2 | 418187 | **Станок резьбошлифовальный , модель 5822М,** 1975 г. в. | **2 640,00** | 132,00 |
| 3 | 408102 | **Вертикально-фрейзерный станок с ЧПУ 6т13ф3-1** | **4 440,00** | 222,00 |
| 4 | 401326 | **Токарный станок 16А20Ф3С15 С ЧПУ** | **7 800,00** | 390,00 |
| 5 | 440846 | **Станок вертикально-фрезерный 6М12П** | **2 760,00** | 138,00 |
| 6 | 428233 | **Пресс К2130в** | **2 520,00** | 126,00 |
| 7 | 428229 | **Пресс КР. КД2126 (Сальск)** | **2 280,00** | 114,00 |
| 8 | 428214 | **Пресс кривошипный КА 2126 (Сальск)** | **2 280,00** | 114,00 |
| 9 | 428176 | **Пресс кривошипный КА2330** | **7 080,00** | 354,00 |
| 10 | 418225 | **Станок шлифовальный 35131М** | **3 840,00** | 192,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** в день подписания договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата, место и время проведения аукциона | **25.05.2020 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| Дата, место и время окончания приема документов | **22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| Продавец | **ЗАО «МВЗ Фарбатек»,** г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 3, каб. 39, антресоль № 2 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, пр-т Партизанский, 8**

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 428316 | **Пресс ус.КД2330** | **7 080,00** | 354,00 |
| 2 | 411250 | **Станок вертикально-сверлильный 2Н118** | **3 120,00** | 156,00 |
| 3 | 401189 | **Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1968 г. в. | **2 760,00** | 138,00 |
| 4 | 401172 | **Станок токарно-винторезный 1К-62,** 1965 г. в. | **2 760,00** | 138,00 |
| 5 | 462314 | **Кран-балка** (однобалочная, гр. 2 т) | **2 280,00** | 114,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 19.00. Ответственное лицо: Короткевич Владимир Александрович, тел. +375 29 608-47-06

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** в день подписания договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| Дата, место и время проведения аукциона | **25.05.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| Дата, место и время окончания приема документов | **22.05.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**